WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 САКАВІКА 2010 г. СУБОТА № 42 (26650)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІЦЫ!**

Прыміце мае шчырыя віншаванні з цудоўным святам — Днём жанчын.

Ва ўсіх галінах дзейнасці грамадства і дзяржавы, у розных сферах чалавечага жыцця вы праяўляеце свае лепшыя рысы — дабрыню і спагадлівасць, духоўнасць і міласэрнасць, высокі прафесіяналізм і адказнасць. Дзякуючы вам нястомна абнаўляюцца жыццёвыя сілы беларускага народа, дынамічна развіваюцца адукацыя і навука, культура і мастацтва, ахова здароўя і спорт.

Няхай і надалей вашымі талентамі, працай, грамадзянскай актыўнасцю памнажаюцца слава, дабрабыт і прыгажосць Беларусі.

Радасці вам і здароўя, узаемаразумення і згоды ў сям'і, дастатку ў доме і ўдачы.

Будзьце шчаслівыя і каханыя!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАЯЎЛЯЕ АБ НЕДАПУШЧАЛЬНАСЦІ ЗГОРТВАННЯ ГАЛІНЫ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ ЛЁНУ Ў БЕЛАРУСІ

**Адпаведную заяву Прэзідэнт Беларусі зрабіў учора на нарадзе ў Оршы па развіцці льняной галіны.**

«Размовы аб тым, што трэба скарачаць пасевы лёну, знішчаць вытворчасць ільнопрадукцыі, — недарэчныя размовы».

«Мы асколак вялікай імперыі, у якой быў разумна прадуманы падзел працы. Калі мы сталі суверэннай дзяржавай, у нас засталася тая вытворчасць, якую мы, калі існавалі б па-за гэтай імперыяй, ніколі не будавалі б. Але яна нам засталася, і мы з вамі яшчэ 15 гадоў таму дамовіліся, што мы ні ад чаго не будзем адмаўляцца, таму што створаны школы, вытворчасці, рабочыя месцы для людзей».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для вытворчасці якаснай ільнопрадукцыі ў Беларусі ёсць усё: адпаведныя кліматычныя ўмовы, кадравыя рэсурсы, тэхналогіі. «На гербе нашай краіны — лён. І справа тут не ў эмоцыях, Скажыце, ці магу я згадзіцца з прапановай урада знішчыць ільноперапрацоўку?».

Паводле слоў Прэзідэнта, задача нумар адзін сёння — вырабіць аптымальную колькасць ільновалакна, якую можна перапрацаваць і прадаць.

«Ільнаводчай галіне Беларусі быць! — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўпэўнены, мы можам стварыць ільнаводчую галіну, якая будзе адной з лепшых у свеце».

Аляксандр Лукашэнка выказаў рэзкае нездавальненне работай беларускіх ільнозаводаў. «У мяне такое ўражанне, што вы самі сёння не разумееце толкам, што трэба рабіць з галіной, — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да членаў урада і кіраўнікоў прадпрыемстваў. — Вы не правялі даследаванні рынку. У вас няма цэласнага ўяўлення аб тым, як трэба мадэрнізаваць галіну».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на вялікія залежы гатовай прадукцыі на складах. «Гэта ж дзясяткі мільярдаў рублёў гадамі замарожаны ў нерэалізаваных тканінах, — абурыўся ён. — Так адбываецца, таму што вы вырабляеце неканкурэнтаздольную прадукцыю, якая не задавольвае спажыўцоў ні па якасці, ні па памерах, ні па расфарбоўцы». Паводле слоў Прэзідэнта, тэхнічнае пераўзбраенне льнокамбіната кропкавае: «Нешта паднавілі, нешта падлаталі, а эфектыўнай тэхналагічнай палітыкі няма».

«Трэба ўсё прайсці, усё палічыць, перш чым укласці некалькі мільярдаў рублёў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Няма цэласнага падыходу, каб прайсці ад вугла да вугла і сказаць дакладна: гэта мы знасім, гэта мы мадэрнізуем і г.д. Ніхто гэтага не ведае. І гэта мяне засмучае больш, чым што-небудзь. Я, перш за ўсё, звяртаюся да прэм'ер-міністра і ўрада». «Я ўжо не гавару аб кіраўніку канцэрна. Вы ўпачатку гэтак бойка хацелі мне расказаць пра нейкія дасягненні... Але чым далей мы з вамі праходзілі па камбінату, тым больш маўклівымі вы станавіліся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Вы, напэўна, мяне прывезлі, каб паказаць, як вы прыгожа працуеце, але калі мы пайшлі па закутках — дык мы выявілі «каменны век», — дадаў ён.

Прэзідэнт строга крытыкаваў умовы працы, у якіх працуюць людзі на прадпрыемстве. «Ні адна з вашых жонак не працавала б у такіх умовах. Ваш найпершы абавязак — гэта датычыцца кіраўніка канцэрна і кіраўніка прадпрыемства — неадкладна, на працягу 2-3 месяцаў стварыць нармальныя ўмовы для людзей там, дзе ім сёння дыхаць няма чым — яны дыхаюць пакуллем, смеццем, хламам, пылам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, «ні пра якую эфектыўнасць ільнокамбіната не можа быць і гаворкі». «Нейкай разумнай прапрацоўкі пытання тут я не ўбачыў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Кажуць, сёння няма эфектыўнай структуры кіравання льнаводчай галіной. Можа, і ёсць, але вы не спрабавалі эфектыўна задзейнічаць».

«Ну давайце створым холдынг, вытворчае аб'яднанне, яшчэ штонебудзь — але калі вы не будзеце варушыцца, то ў вас нічога не атрымаецца і з новай структурай кіравання», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Калі трэба ствараць гэту новую структуру — стварайце. Але яна не павінна быць толькі новым прыстанішчам для бюракратаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Хоць пэўныя станоўчыя зрухі ёсць, але калі ўлічыць, што дзяржава за апошнія пяць гадоў выдзеліла арганізацыям ільняной галіны толькі ў выглядзе субсідый амаль Br560 млрд, — можна было чакаць больш значных вынікаў».

Прэзідэнт Беларусі запатрабаваў устараніць парушэнні тэхналогіі вырошчвання лёну ў краіне.

«З-за нізкай якасці сыравіны доля найбольш каштоўнага доўгага валакна складае ўсяго каля 20 працэнтаў, — канстатаваў Прэзідэнт. — І ўсё таму, што паўсюдна парушаецца тэхналогія вырошчвання лёну. Акрамя таго ў нас няма механізму, які стымулюе гаспадаркі аддаваць ільнопрыдатныя глебы спецыялізаваным атрадам прадпрыемстваў».

«Возьмем пачатковае звяно цыкла — вытворчасць трасты. У нас гэтым займаюцца 208 ільнасеяльных гаспадарак, а таксама 49 ільнозаводаў. Здавалася б, такой колькасці пад сілу выконваць гадавыя заданні па зборы і выпрацоўцы льновалакна. Аднак за 5 гадоў мы не выраблялі больш за 40 тыс. тон валакна пры плане 60 тыс. тон», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама канстатаваў напляваецельскае стаўленне да выканання аптымальных тэрмінаў уборкі лёну, рассцілання і пад'ёму трасты. Часта яе падымаюць не ў верасні, а ў лістападзе, калі ад дажджоў яна значна страціла ў якасці.

Звяртаючыся да міністра сельскай гаспадаркі Сямёна Шапіры, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Калі не вырасціш і не паставіш нармальную сыравіну для прадпрыемстваў — са мной працаваць не будзеш... Што за праблема атрымаць нармальную трасту, на такім узроўні якасці, як у Францыі і Бельгіі, каб атрымаць хоць бы 60 тыс. тон валакна ў год». Прэзідэнт даручыў Мінсельгасхарчу жорстка вытрымаць тэрміны сяўбы лёну — 10 дзён.

Кіраўнік дзяржавы даручыў у самыя кароткія тэрміны ўстанавіць на аршанскім прадпрыемстве новае абсталяванне. Для гэтага павінен быць спрошчаны парадак яго закупкі. Камітэту дзяржкантролю даручана пракантраляваць эфектыўнасць працэсу закупкі абсталявання. Аляксандр Лукашэнка даручыў павялічыць дзяржзаказ на льнопрадукцыю.

Прэзідэнту было даложана, што толькі каля 20 працэнтаў прадукцыі, што выпускаецца на льнокамбінаце, апрацоўваецца па высокіх стандартах якасці.

Прэзідэнт выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што льнаводчая галіна і вытворчасць прадукцыі з лёну ў Беларусі могуць і павінны быць канкурэнтаздольнымі. «Мяне пераконвалі, што мы не можам на належным узроўні вырошчваць ячмень, а потым пераканаліся, што гэта цалкам магчыма. Мне гаварылі, што ў Беларусі не атрымаецца вырошчваць якасны буракова цукар, а сёння гэта стратэгічны рэзерв. Упэўнены, менавіта гэтак жа і з лёнам», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, зніжэнне якасці льносыравіны недапушчальнае.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

### Расія зацягвае выкананне дамоўленасцяў па ўмовах пастаўкі нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь

**Расійскі бок зацягвае выкананне шэрагу дамоўленасцяў, дасягнутых у выніку перагавораў 27 студзеня 2010 года ў Маскве аб умовах пастаўкі нафты і нафтапрадуктаў з Расійскай Федэрацыі ў Беларусь.**

Аб гэтым заявіла ў інтэрв'ю журналістам намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Наталля Рынкевіч, перадае БЕЛТА.

Блакіраванне вырашэння гэтага пытання не толькі супярэчыць двухбаковым дамоўленасцям, але і вядзе да істотных эканамічных стратаў для суб'ектаў гаспадарання краін.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.03.2010 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША 2 945,00 | 1 чэшская крона 155,11 | USD 29,8366 |
| ▼ 1 еўра 4 003,43 | 1 польскі злоты 1 031,09 | UAH 37,1796 |
| 1 латвійскі лат 5 653,13 | ▲ 1 расійскі рубель 98,70 | 1000 BYR 10,1485 |
| 1 літоўскі літ 1 160,23 | 1 украінская грыўня 369,16 | EUR 40,5211 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

10042

9 771990 763008

## ПАЭТ МІКОЛА АЎРАМЧЫК У 79 ГАДОЎ АЖАНІЎСЯ СА СВАІМ ПЕРШЫМ КАХАННЕМ

*Неверагодную гісторыю кахання 90-гадовы старэйшына беларускай літаратуры ўпершыню наважыўся распавесці менавіта чытачам «Звязды» напярэдадні 8 сакавіка*

Глеб ЛАБАДЗЕНКА

**У 1937 годзе дзевяцікласнік Коля з вёскі Плёсы, што пад Бабруйскам, закахаўся па вушы ў шасцікласніцу Анюту з вёскі Ступяні. Яны вучыліся разам у школе ў Цялушы. Сталі сустракацца — некалькі гадоў — планавалі нават ажаніцца. Коля, які пісаў вершы, дасылаў іх у Мінск, сустрэўся там з вялікім Купалам, яго дабраславіў на паэтычны лёс сам Якуб Колас. Коля паступае вучыцца ў мінскі педінстытут, Анюта — у бабруйскую медвучэльню. Пасля Анюта раптоўна выходзіць замуж за... Колевага аднакласніка Пашу. У Колі таксама з'яўляецца свая сям'я. Так праходзіць жыццё. Колева жонка і Анюцін муж паміраюць — і вось праз 60 гадоў Мікалай Якаўлевіч і Ганна Сямёнаўна зноў сустракаюцца. І з таго дня не разлучаюцца вось ужо 10 гадоў.**

**...Гэтую неверагодную гісторыю Мікола Аўрамчык згадаў мімаходзь яшчэ ў студзені, калі мы гутарылі з нагоды ягонага 90-годдзя (гл. «Звязду» ад 30 студзеня 2010 года). Напярэдадні 8 сакавіка — свята жанчын і кахання — я папрасіў старэйшыну беларускай літаратуры распавесці сваю фантастычную гісторыю кахання для чытачоў «Звязды» больш падрабязна.**

### АНЮТА

**Мікола закахаўся ў Анюту ў дзявятым класе — яму было 17, ёй 15 гадоў, Анюта хадзіла ў шосты клас. Сустракаліся, будавалі сумесныя планы.** Калі Мікола Аўрамчык заканчваў школу, ягоныя вершы ўжо друкаваліся ў раённым і нават рэспубліканскім друку. Узімку 1938 года яго выклікалі ў рэдакцыю бабруйскай раёнкі — і папрасілі нікуды не паступаць, а адразу ісці працаваць да іх. Мікалай згадзіўся. Але паралельна працягваў дасылаць вершы ў кабінет маладога аўтара Саюза пісьменнікаў. І раптам Аўрамчыка выклікаюць у Мінск на месячныя курсы маладых аўтараў. Адразу ж пасля курсаў Мікалай — так склалася — паступіў у педінстытут. Анюта ў сваю чаргу паступіла ў медтэхнікум у Бабруйск (кінула праз два гады, бо страшэнна баялася крыві). Калі б не гэтыя курсы, яны б пажаніліся, кажа Аўрамчык цяпер.

Мікалай вучыўся і працаваў. Гады ў рады — у час адпачынку, вакацый, святаў — прыязджаў да Анюты. Так цягнулася яшчэ два гады, як раптам...

— Аднаго дня да мяне ў Мінск прыязджае аднакласнік Паша, які за два гады скончыў вучэльню, стаў вайскоўцам і якраз ехаў на месца службы, — згадвае Мікола Аўрамчык. — Сталі гутарыць, як Паша кажа: «Коля, а я ж ажаніўся!» Пытаюся, з кім. З Ганнай... У мяне мову заняло... Ганна з'ехала з ім на Далёкі Усход, а я гады два не мог яшчэ глядзець на дзяўчат — такі гэта быў для мяне ўдар.

Аўрамчык кажа, што перад гэтым шчыра верыў у каханне на адлегласці. І, хоць жыў ужо ў Мінску, аднак увесь час думаў пра Ганну, пры любой магчымасці імкнуўся да яе ў Бабруйск. А яна не дачакалася...

— Прысвячаў ёй вершы, — кажа Аўрамчык. — Санет «Кветка бэзу» з прысвячэннем «А.Кр.» — Анюце Крычцы. Адзін верш нават у «Полымі» надрукавалі — праўда, без прысвячэння.

Карацей, Ганна апынулася на Далёкім Усходзе, дзе і прабыла ўсю вайну...

Ад тае гісторыі кахання застаўся здымак мілай дзяўчыны з надпісам на адвароце «На памяць Колю ад Ані. 13.VI.1940» Праз два месяцы Ганна выйшла замуж за іншага.

### ПАЛІНА

Мікола яшчэ доўга захоўваў тое моцнае пачуццё. Ёсць нават адзін верш, даволі вядомы, дзе Аўрамчык паставіў прысвячэнне будучай жонцы Паліне — а насамрэч, прызнаецца цяпер, верш той быў напісаны пра Анюту...

...З Палінай Мікола пазнаёміўся за тры месяцы да пачатку вайны. Ён жыў тады ў бараку для студэнтаў — на вуліцы Студэнцкай, у раёне цяперашняга Інстытута культуры. Яе падсялілі туды ж.

— Упершыню я яе ўбачыў на кухні, дзе браў кіпень для гарбаты — так што першая сустрэча была «цёплай»!.. Другі раз мяне паклікалі да тэлефона, які — адзін на ўсіх — вісеў у інтэрнаце. Мне тэлефанавалі з рэдакцыі, я паразмаўляў і пайшоў да сябе ў пакой. І ў адчыненых дзвярах аднаго пакоя пабачыў дзяўчыну, якая прыбірала, падмятала пакой. Спыніўся. Загаварыў з ёй.

**— Напэўна, як паэт, вы сказалі: «Дзяўчына, як вы прыўкрасна мецяцё пакой!»?..**

— Што вы — я заўжды бянтэжыўся, калі трэба было вось так загаворваць ці казаць нешта на людзях!.. Мне нібы цяляты язык аджавалі!.. Пыкнуў-мыкнуў нешта, яна кажа: «Заходзь, чаго на калідоры стаіш!..» Сталі сустракацца... Пачалася вайна, усе ўцякалі. ЦК усё ўцякло, рэдакцыя «Звязды» ўцякла — і нават нам не паведамілі, мы яшчэ пяць дзён сядзелі!.. Я пехатой пабег да сваіх на Бабруйск — цягнікі не хадзілі, быў узарваны мост. У дарозе мне паведамілі, што Бабруйск ужо занялі немцы. Я павярнуў — і пабег на ўсход. Там даведаўся, што іду па Кіраўскім раёне — а Паліна ж якраз адтуль — пайшоў у ейную вёску. А яна гадзіны дзве як прыбегла з Мінска! Я пераначыў, мне знайшлі школьную геаграфічную карту, наклалі цэлую торбу мёду і сала — і я пабег далей на Магілёў...

Каханыя развіталіся на доўгія пяць гадоў. Мікола паспеў пабыць у самым пекле фронту, быў узяты ў палон, працаваў у немцаў на шахтах, цудам выжыў, пасля вызвалення быў адпраўлены як «палонны» ў Данбас на цэлы год.

СТАР. 2




Фота БЕЛТА.



Аўрамчык з сённяшняй жонкай.

## Наталля ПЯТКЕВІЧ: «Ідэалагічная вертыкаль у Беларусі адбылася»

**Пастаўленая задача адрадзіць на вышэйшым узроўні ідэалагічную работу ў Беларусі ў поўнай меры рэалізуецца. Такую думку выказала першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Пяткевіч, якая прымала ўдзел у рабоце рэгіянальнай канферэнцыі ідэалагічных работнікаў Брэсцкай вобласці ў Кобрыне, перадае БЕЛТА.**

«Сёння мы ўжо можам сказаць, што ідэалагічная вертыкаль у нашай краіне ёсць, і мы ўжо гаворым не пра станаўленне, а пра ўдасканаленне яе работы», — сказала Наталля Пяткевіч.

У якасці пазітыўнага змянення яна адзначыла з'яўленне ідэолагаў не толькі ў дзяржаўнай сферы, але і ў прыватным бізнэсе. «Прыемна адзначыць, што на прыватных прадпрыемствах выбудоўваецца ідэалагічная работа, і гэта не націск зверху, а сапраўды патрэбнасць. Гэта вельмі важна, таму што задача ідэалагічнай работы — ствараць непасрэдны кантакт паміж простым чалавекам і ўладай, садзейнічаць выяўленню патрэбнасцяў, праблем людзей і іх вырашэнню. Гэта галоўная задача, без вырашэння якой не можа існаваць дзяржава, і гэта галоўнае прызначэнне ідэолага», — лічыць Наталля Пяткевіч.

Паводле слоў Наталлі Пяткевіч, у апошнія гады электарат вельмі змяніўся: значна павысілася палітычная, прававая, эканамічная культура грамадзян. Гэтыя перамены патрабуюць асабліва ўважлівых адносінаў да праблемы кадраў у ідэалагічнай сферы, лічыць яна.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла, што сёння адной з важнейшых задач, якія неабходна вырашыць, з'яўляецца фарміраванне сучаснай, крэатыўна мыслячай, ініцыятыўнай ідэалагічнай вертыкалі, здольнай аператыўна рэагаваць на зменлівую рэальнасць.

Новыя падыходы, на думку Наталлі Пяткевіч, неабходныя і ў пытаннях падрыхтоўкі кадраў, у тым ліку размова ідзе аб забеспячэнні пастаяннай магчымасці павышэння кваліфікацыі.

На слыху

## ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ БЕЛАРУСЬ НЕ ЗМЯНЯЕ

**Урад суседняй Літвы абвясціў пра намер павысіць узрост выхаду на пенсію. Чакаецца, што праз тры гады як мужчыны, так і жанчыны ў гэтай краіне змогуць скарыстаць права на заслужаны адпачынак толькі ў 65 гадоў.**

Варта заўважыць, што апошнім часам на павелічэнне пенсійнага ўзросту пайшла большасць постсавецкіх краін. Дастаткова высокай застаецца «ўзроставая планка» і на Захадзе: 60 гадоў для ўсіх грамадзян Францыі, 65 гадоў — для ўсіх грамадзян Германіі, Іспаніі, ЗША і Канады, 60 гадоў для жанчын і 65 гадоў для мужчын у Італіі. На гэтым фоне вылучаюцца тры дзяржавы — Расія, Украіна і Беларусь. Агульны пенсійны ўзрост тут застаецца без змен і складае 55 гадоў для жанчын і 60 гадоў для мужчын.

Прычым таксама не сакрэт: у Беларусі, як і ў абсалютнай большасці заходніх і постсавецкіх краін, абвастраецца дэмаграфічная праблема. Яе вынікі відавочныя: колькасць працуючых плацельшчыкаў пенсійных узносаў будзе скарачацца, тады як колькасць пенсіянераў — наадварот, узрастаць. Ці не прывядзе гэта да павышэння пенсійнага ўзросту?

— Сапраўды, дэмаграфічная сітуацыя складваецца няпроста, тым не менш пытанне аб змяненні пенсійнага ўзросту ў Беларусі сёння не разглядаецца, — заўважыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва.** — Для захавання стабільнасці айчыннай пенсійнай сістэмы выкарыстоўваюцца іншыя шляхі: скажам, увядзенне прафесійнага пенсійнага страхавання — фінансаванне датэрміновых пенсій за кошт дадатковых адлічэнняў наймальнікаў дазволіць «разгрузіць» агульны «пенсійны фонд».

**Сяргей ГРЫБ.**

## НА СВЯТА ЎНАЧЫ ДА 23 МАРОЗУ

**У гэтыя выхадныя на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца сапраўды зімовы характар надвор'я, паведаміў рэдакцыі <u>начальнік службы гідраметэапрагназаў Дзмітрый РАБАЎ.</u>**

Сёння месцамі пройдзе невялікі снег. Тэмпература ўначы мінус 6—11, пры праясненнях да 16 марозу, удзень мінус 2—7 градусаў, па паўднёвым захадзе — каля нуля. Невялікі снег чакаецца і ў нядзелю, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы мінус 3—13, пры праясненнях да 18 марозу, удзень — 2—9 градусаў ніжэй за нуль. На жаночае свята ападкаў ужо не будзе, але стане яшчэ халадней, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература ўначы мінус 9—16, у паўночных раёнах да мінус 20, пры праясненнях да 23 марозу; удзень — мінус 2—9 градусаў. І ў аўторак захаваецца халоднае надвор'е, калі маразы ўначы будуць дасягаць мінус 10—16, пры праясненнях да 20—23, удзень — 0—мінус 6 градусаў. Удзень месцамі кароткачасовы снег. Толькі пачынаючы з серады наступнага тыдня чакаецца кардынальная змена надвор'я, калі да нас пачне паступаць больш цёплае паветра з боку Атлантыкі. Маразы ўначы аслабеюць, а тэмпература ўдзень будзе дасягаць ужо ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ЛИДСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ извещает о снятии с торгов земельных участков, расположенных в г. Лида:**

**по ул. Космонавтов,** У-68 для строительства торгово-развлекательного центра; **по ул. Свердлова,** У-69 для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием; **по ул. Крупской** для строительства станции технического обслуживания; **по ул. Свердлова,** У-81 для строительства пункта технического обслуживания легковых автомобилей с автомоечным комплексом; **по ул. Центральной,** У-82 для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров, выставленных для продажи на аукционе 16 марта 2010 г., на право заключения договоров аренды земельных участков. (Решение райисполкома от 1 марта 2010 г. № 203.)

УНП 500826128.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ КОМИССИИ ПО РАБОТЕ С ИМУЩЕСТВОМ, ОБРАЩЕННЫМ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА ПРИ БОРИСОВСКОМ РАЙИСПОЛКОМЕ,

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства имущества, расположенного по адресу: **Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36** в составе: **Лот № 1:** часть центрального склада, общ. пл. 803,3 кв.м. Начальная цена (снижена на 20 %) — 156 172 780 бел. рублей. **Лот № 2:** часть центрального склада, общ. пл. 285,1 кв.м. Начальная цена (снижена на 20 %) — 55 427 570 бел. рублей. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **08.04.2010 в 15.00** по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.04.2010** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12. Сайт в интернете: www.rtf.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

### Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі па методыцы МВФ скараціліся за студзень-люты на 1,3 працэнта

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па методыцы МВФ, скараціліся за студзень-люты 2010 год на 1,3 працэнта (на $75,4 млн.) да $5577,1 млн. Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні зменшыліся за два месяцы на 1,1 працэнта (на $68,6 млн.) да $5909,9 млн.

**БЕЛТА.**

### За распіццё піва за горадам на прыродзе ў шэрагу выпадкаў пагражае штраф

**За распіццё спіртнога ў лясных масівах, на паплавах, на берагах вадаёмаў (пляжах) і ў іншых такіх месцах, што знаходзяцца па-за населенымі пунктамі, у шэрагу выпадкаў пагражае штраф. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла <u>прэс-афіцэр УУС Мінаблвыканкама Марына ЭВЕРСМАН.</u>**

Пасля ўступлення ў сілу новай рэдакцыі КоАП, якая забараняе ў грамадскіх месцах ужыванне не толькі моцных спіртных напіткаў, але і слабаалкагольных, грамадзяне сталі цікавіцца: ці будзе накладацца штраф за распіццё алкаголю за горадам на прыродзе? Ва УУС растлумачылі, што лясы і паплавы могуць лічыцца грамадскімі месцамі, калі група адпачывальнікаў ужывае спіртныя напіткі на вачах у іншых. Калі ж кампанія аб'ектыўна аддалена ад іншых грамадзян і распіццё алкаголю адкрыта не дэманструецца, то састаў адміністрацыйнага правапарушэння адсутнічае. Таксама ў гэтай сітуацыі не трэба забываць аб адказнасці за парушэнне нормаў экалагічнай бяспекі навакольнага асяроддзя і парадку прыродакарыстання, а таксама пажарнай бяспекі. Распіццё спіртнога не дапускаецца на прыдарожных стаянках загарадных трас, калі, зразумела, там няма месца, якое спецыяльна для гэтага прызначана. Гэта можа быць, напрыклад, кавярня або невялікі рэстаран. Калі ж грамадзяне з'едуць на абочыну і, згодна з народнай традыцыяй, арганізуюць застолле на капоце, міліцыя таксама можа аштрафаваць іх. Абочына — грамадскае месца, бо вадзіцелі і пасажыры, якія праязджаюць міма, будуць бачыць, што людзі распіваюць спіртное.

Такія заканадаўчыя змяненні не прызначаны ўскладніць жыццё грамадзянам. «Рэформа прадыктавана хутчэй тымі абставінамі, што менавіта дэманстратыўнае, публічнае распіццё спіртнога стала літаральна культывавацца насельніцтвам», — падкрэслілі ў міліцыі.

### 2 КІЛО ЮВЕЛІРНЫХ ВЫРАБАЎ З ЗОЛАТА

**было знойдзена ў аўтамабілі затрыманага за парушэнне правілаў аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі 38-гадовага брастаўчаніна.**

Мужчына «запаліўся» на прывакзальнай плошчы чыгуначнага вакзала Брэст-Цэнтральны: супрацоўнікі АБЭЗ Брэсцкага АУСТ затрымалі яго падчас рэалізацыі двух ювелірных вырабаў з золата коштам больш за Br700 000. Гэтыя вырабы не мелі прабірнага кляйма Беларусі і былога СССР. А на наступны дзень у машыне падазронага пры вобыску знойдзена і канфіскавана 275 залатых ювелірных вырабаў вагой амаль 2 кілаграмы. Гэты «клондайк» «пацягнуў» на суму больш як 150 мільёнаў рублёў. Заведзена крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# СВЯТА ПАНЯДЗЕЛКА

*Верніцы і 8 сакавіка — з Богам!..*

**Ну як правесці гэты дзень? Варыянты, бясспрэчна, ёсць. Кветкі — кветкамі, іх атрымліваць прыемна ў любы дзень. Але ж 8 сакавіка — вольны дзень, калі не трэба ісці на працу. А для любой жанчыны дадатковы вольны дзень — вялікі набытак, бо ёсць магчымасць зрабіць тое, да чаго не даходзілі рукі ў звычайным рэжыме. Асабліва, калі гэты вольны дзень прыпадае на панядзелак — потым быццам бы і тыдзень пройдзе хутка. І яшчэ ёсць магчымасць засяродзіцца на сабе. Бо парадак навялі напярэдадні. З хатнімі справамі разабраліся. І што яшчэ трэба жанчыне?.. Проста адчуць сябе ЧАЛАВЕКАМ. Зазірнуць ва ўласную душу, каб знайсці адказ на пытанне, якое час ад часу ўзнікае: дзеля чаго я ўсё цягну, чаму цярплю, ці на таго малюся, ды ці шчырыя мае малітвы?**

Жанчыны, якія аднойчы знайшлі адказ на іх, пачынаюць па-іншаму глядзець на святы. Бо сапраўды з малітвай і цярпець, і цягнуць можна асэнсавана, не адчуваючы пры гэтым цяжару быцця — калі з мірам у душы. Калі з Верай. І тады прыходзіць разуменне, што дзень, які прыпадае на Вялікі пост, трэба прысвячаць Богу. Нават калі гэта 8 сакавіка — пост больш значны, чым нашы жаданні дагадзіць сабе. Праваслаўныя вернікі, напрыклад, ведаюць, што ёсць свята жанчын-Міраносіц, з якім віншуе і бласлаўляе на ўвесь год сам Бог. Прычым нават тых жанчын, якія можа яшчэ не ведаюць пра свята, якое адзначаецца Царквой у трэцюю нядзелю пасля Вялікадня — у гэты дзень вернікі моляцца за здароўе і дабрабыт усіх прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва. А калі ёсць боскае свята ў гонар жанчын, то святары Беларускай праваслаўнай царквы раяць пачакаць і не парушаць самы строгі за год Вялікі пост.

**Павел СЯРДЗЮК, настаяцель храма імя святога Мікалая Японскага (Каменная горка) раіць, як можна правесці гэты дзень з большай карысцю для душы:**

— 8 Сакавіка Царквой не адзначаецца, бо ёсць дзень, калі ўслаўляюць богалюбівых жанчын. Але мы жывём у грамадстве, бачым, як шануюць у ім жанчын, што для людзей ёсць час жанчын. Але час — катэгорыя вельмі важная і дарагая. Час даецца ў спадчыну лёсам кожнаму з нас. А мы як багатыя нашчадкі вельмі часта прамотваем спадчыну бацькоў, не ведаючы, як можна патраціць яе з карысцю. І як правесці той жа вольны дзень, які мы атрымалі ад дзяржавы. Але калі разабрацца, то кожная жанчына поўная надзей: маці — на будучыню дзяцей, жонка — што муж будзе кахаць, дзяўчына — што выбраннік будзе ёй адданы. Вось гэта і ёсць тое, пра што варта думаць і на што варта скарыстаць час. І гэты дзень можна прысвяціць малітве, каб дзякаваць Богу за тое, што маем — за такія якасці, як прыгажосць і душэўнасць, прасіць яго дапамогі і заступніцтва ў тым, за што баліць душа. Тыя, хто лічыць сябе хрысціянкамі, павінны разумець, што гэта дзень Вялікага посту і ўстрымлівацца ад разгульных песняў з танцамі, застолляў. Няхай гэта будзе час сямейнага ачага. А для жанчын, якія з розных прычын яго не маюць, — час папрасіць прабачэння ў Бога, прасіць у малітвах, каб утрымаў ад памылак і ахінуў сваёй любоўю і спагадай.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ...МІКОЛА АЎРАМЧЫК У 79 ГАДОЎ АЖАНІЎСЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вярнуўшыся ў Мінск, Аўрамчык захацеў працягваць адукацыю. З педінстытута перавёўся на аддзяленне журналістыкі філфака БДУ. Стаў шукаць Паліну.

— Сястра сказала мне, што бачыла Паліну — тая збіралася ў Мінск вучыцца, — згадвае Мікола Якаўлевіч. — Даведаўся, што яна займаецца таксама на аддзяленні журналістыкі, пайшоў з таварышам да іх у інтэрнат. Іх там жыло дваццаць дзяўчат у пакоі — я пасля пра гэта напісаў верш «Студэнцкая быль». Знайшоў яе — і мы сталі сустракацца ў школах, тады ж універсітэт быў па школах размеркаваны. Сустракаліся ў другой школе насупраць Палаца піянераў *(цяпер гэта адзін з карпусоў лечкамісіі.* — **Г.Л.**), у чацвёртай школе — побач з Нацыянальнай бібліятэкай *(сённяшняя вуліца Чырвонаармейская.* — **Г.Л.**), і найбольш у школе № 17 каля Юбілейнага базару. І праз два-тры месяцы ажаніліся.

**— Як хутка!.. Залічылі ранейшыя сустрэчы?..**

— Ну так, мы ж да вайны кожны дзень сустракаліся, хадзілі ў кіно, у тэатры...

**— І дзе вы жылі калі ажаніліся?**

— Спачатку асобна. Я — у хімкорпусе БДУ, там адзін з паверхаў быў пад інтэрнат адведзены. Пасля жылі ў суседніх пакоях у бараку — я з хлопцамі, яна з дзяўчатамі. А пасля хлопцы (нас жыло чацвёра ў пакоі) адгарадзілі мне шырмаю куточак — і мы з жонкай ужо сталі жыць разам. Пасля барак раздзялілі перагародкамі — і мы атрымалі закуточак, нават з акном! Нам нічога не свяціла ў сэнсе жытла. Яна размеркавалася працаваць у маю родную вёску, я сабраўся ехаць за ёй. Працаваў на той час у «Полымі» — занёс Танку заяву. Танк заяву прачытаў і паклаў пад шкло тварам уніз. Спытаўся, чаго так. Я патлумачыў. Танк павёў мяне ў Саюз пісьменнікаў да Броўкі. Кажа Броўку: «Пятрусь, Аўрамчык у вёску сабраўся — жыць няма дзе». Броўка здымае трубку «вяртушкі» і да некага звяртаецца: «Слухай, тут у мяне з Аўрамчыкам дрэнная справа — кватэры ў яго няма». Нехта на тым канцы адказвае: «Я дам Аўрамчыку кватэру». Броўка кладзе трубку — і кажа: «Длугашэўскі сказаў, што будзе табе кватэра». А Канстанцін Навумавіч Длугашэўскі быў тады мэрам Мінска. Прайшло колькі часу — усё ціха. Я паехаў у вёску да жонкі. Праз нейкі час прывёз вершы ў рэдакцыю «Полымя» — сустракаю на вуліцы Броўку. Ён кажа: «Схадзі да Длугашэўскага, ён кажа, што табе кватэру падрыхтаваў». Я набраўся смеласці, пайшоў. Тады гарсавет быў там, дзе цяпер краязнаўчы музей, па Маркса *(Нацыянальны гістарычны музей.* — **Г.Л.**) Я прыйшоў — мяне запісалі 64-м у чарзе. Дачакаўся, заходжу. Бачу — ён мяне не пазнае. Я кажу: «Броўка сказаў, што вы мне кватэру дасцё...». Ён усхапіўся: «А! Аўрамчык! Я цябе не пазнаў!» І дастае з шуфляды ордэр на кватэру. Кажа: «Даруй, толькі 17 метраў з калідорам і кухняй, ацяпленне на дровах, у двары — хлявок на дровы...». Я адказаў, што шчаслівы і з гэтага!.. Вядома ж, адразу перавёз жонку ў Мінск.

**— Дык адкуль Длугашэўскі вас ведаў?**

— У той час у Купалаўскім тэатры часта ладзіліся паэтычныя вечары, на кожным з якіх я дэкламаваў вершы. А ўся вярхушка, і ён таксама, сядзелі тады ў першым шэрагу. А пасля я даведаўся таксама, што ён з аднае вёскі з пісьменнікам Адамам Бабарэкам. Вось так я «за вершы» атрымаў кватэру!..



*Коля і Анюта, развітаўшыся ў 1940, сустрэліся зноўку ў 1999 — каб быць разам назаўжды.*

У Міколы Якаўлевіча і Паліны Аляксандраўны нарадзіліся тры дачкі. Яны пражылі разам 47 гадоў — пакуль Паліна Аляксандраўна не памерла ў 1993 годзе. Праз шэсць гадоў, у 1999-м Аўрамчык зноўку сустрэў... Анюту! Толькі цяпер яе больш дарэчна называць...

## ГАННА СЯМЁНАЎНА

— Я штогод бяру ўдзел у Пушкінскім свяце ў вёсцы Цялуша пад Бабруйскам, — працягвае Мікола Аўрамчык. — Там жа пахаваная ўнучка Пушкіна. Яна выйшла замуж за вайскоўца, а калі ён пайшоў у адстаўку — паехала разам з ім на ягоную радзіму. Яны збудавалі найпрыгажэйшую царкву, пад сценамі якой і праводзіцца свята. І вось у 1999 годзе я сустрэў там адну Анюціну суседку-сяброўку — стаў распытваць пра сваё першае каханне. Яна мне распавяла, што Анюта жывая-здаровая, жыве то ў вёсцы, то з дачкой у Бабруйску, даўно страціла мужа — ён моцна піў... Мяне як стралой працяла! Я вярнуўся дахаты, замовіў тэлефонную размову. Яна падняла слухаўку, я кажу: «Анюта, ты мяне пазнаеш?». Яна адказала: «Так, Коля, як я магу цябе не пазнаць...». Я прызначыў спатканне, паехаў, мы сустрэліся — і я застаўся там. І з таго дня не расстаёмся вось ужо 10 гадоў...

**— І было вам 79 гадоў...**

— Так, а ёй 77.

**— Напэўна, доўга размаўлялі пасля стольких гадоў...**

— Перагаварылі шэсцьдзясят гадоў — размаўлялі і дзень, і ноч кожны дзень.

**— Як вы мяркуеце, калі вы зноў пабачылі Анюту — у вас абвастрылася даўнішняе пачуццё ці ўзнікла новае?**

— Нешта і тое, і новае... У нас такі ўзрост, што некаторыя ўвогуле падумаюць: чорт іх знае... Але вельмі свяцілася і саграваў тое пачуццё. Я не мог крыўдаваць на яе, што не дачакалася тады — мне ж яшчэ столькі вучыцца заставалася... Жыццё нашае склалася паралельна — у мяне тры дачкі, у яе дзве дачкі і сын.

**— Вы з 1999 года проста жывяце разам ці неяк узаконілі свае адносіны?**

— Нічога не ўзаконьвалі, вяселля не было. Сем'ямі сабраліся — яе ўсе, мае ўсе. Смешна — якое ў такім узросце вяселле!.. Сястра мая ўвогуле як даведалася — дык страшэнна перажывала. Казала, што людзі шаптацца пачалі, што Аўрамчык з глузду з'ехаў.

**— Але, я так бачу, вы не моцна зважалі на грамадскую думку...**

— Абсалютна не думаў пра гэта! Я лічыў: што я думаю — тое і думаю, што мне да іншых! Шапталіся, вядома ж, розныя там суседкі-сяброўкі... Але не думаў я, і яна не думала — хто што скажа.

**— А дочкі вашы як адрэагавалі?**

— Ты ведаеш, вельмі прыязна — прынялі яе як родную. Я ж ім цэлае жыццё нічога не расказваў пра тое першае каханне. А тут расказаў. Вельмі любяць яе. І ўнучкі мае добра паставіліся...

**— Мікола Якаўлевіч, а тады, калі вы даведаліся, што Ганна таксама засталася адна — адразу ўзнікла жаданне сысціся?**



*Мікола Аўрамчык з жонкай Палінай Аляксандраўнай і трыма дочкамі (злева направа): Наталляй, Святланай ды Ірынай.*

— Добра і не ведаю. Хацелася сустрэцца, убачыцца проста. А як сустрэліся — дык і павіслі на шыі адно ў аднаго. І больш не разлучаліся. Усе гэтыя 10 гадоў праляцелі імгненна. Летась у нас у абодвух здарыўся, відаць, мікраінсульт. І яна мне прапанавала — давай пабудзем гэтую зіму асобна: няхай мае мяне пагледзяць, а твае — цябе. Цяпер яна там з дачкой у Бабруйску, а да мяне тут мае наперабой ездзяць. Перазваньваемся па некалькі разоў кожны дзень. Сяджу, чакаю вясны, каб ехаць да яе.

**Фота з асабістага архіва Міколы АЎРАМЧЫКА.**

## Ну і ну! УЗРОСТ ЮНАЙ САМАГУБЦЫ... ЗАВЫСІЛІ

Буйны штраф — 30 базавых велічыняў заплаціла намеснік галоўнага ўрача Талачынскай раённай бальніцы за тое, што няпоўнагадовая самагубца, з якім бы здзіўленнем наступнае ні ўспрымалася, пасля смерці стала больш дарослай. Каб «не псаваць» статыстыку дзіцячай смяротнасці, медык папрасіла, каб яе падначаленая ўзяла ў сваякоў юнай самагубцы даведку аб нараджэнні, а потым павысіла ўзрост памерлай па сваёй волі.

Як паведаміў «Звяздзе» **пракурор аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Віцебскай вобласці Сяргей ЕРАШОЎ,** выпадак насамрэч неардынарны. Жанчына ў белым халаце спрабавала схаваць выпадак гібелі няпоўнагадовай. За што спачатку ў дачыненні да яе завялі крымінальную справу. Навошта павысілі ўзрост? Як было ўстаноўлена падчас следства, медык баялася, што «дастанецца» ад абласнога начальства за пагаршэнне паказчыка смяротнасці насельніцтва. А дзіцячая смяротнасць на асаблівым кантролі.

За свае дзеянні медык магла быць пазбаўлена волі. Але крымінальную справу закрылі, рашэннем суда яна была аштрафавана.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Браканьеры на снегаходах

Рэйдавая група Касцюковіцкай міжрайінспекцыі за парушэнне Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання затрымала двух грамадзян Расіі, якія ў паляўнічых угоддзях паблізу вёскі Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна незаконна палявалі з выкарыстаннем снегаходаў «Паларыс». Пры затрыманні браканьеры паспрабавалі збегчы. У парушальнікаў канфіскаваны карабін «Сайга» і два снегаходы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

«ВНИМАНИЮ ВЛАДЕЛЬЦЕВ АКЦИЙ ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

**ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» сообщает, что 26 марта 2010 г. по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8**

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»**

С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

- *об итогах работы ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2009 год и Программе его развития на 2010 год;*
- *о результатах ревизии Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2009 год;*
- *о результатах внешней аудиторской проверки бухгалтерской отчетности ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2009 год;*
- *о распределении прибыли ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2009 год;*
- *об утверждении нормативов отчислений от прибыли на 2010 год;*
- *о выплате дивидендов по привилегированным акциям за 2009 год;*
- *о выплате в 2010 году дивидендов по привилегированным акциям ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;*
- *о внесении изменений в Устав ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;*
- *об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи;*
- *об избрании членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».*

***Начало собрания – 11.00.***

Начало регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании - 10.30 при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Информацию по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в собрании, могут получить по месту нахождения головного офиса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и филиалов при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя по следующим адресам:

г. Минск, ул. Мельникайте, 8
г. Витебск, ул. Чапаева, 16;
г. Гомель, ул. Головацкого, 19;
г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;
г. Могилев, пер. 2-й Крутой, 3а.

**Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»**

*Лицензия НБ РБ № 20 от 30.11.2009 г. на осуществление банковской деятельности.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже пустующего дома в деревне Ермолино Верхнедвинского района Витебской области

**Организатор аукциона:** Верхнедвинский районный исполнительный комитет.

**Предмет аукциона**: пустующий жилой дом, расположенный в деревне Ермолино Верхнедвинского района Витебской области общей площадью 52,5 кв. м.

**Начальная цена продажи:** 2 140 624 белорусских рубля.

**Размер затрат на организацию и проведение аукциона:** 838 937 белорусских рублей.

Аукцион состоится **25 марта 2010 г. в 15.00** по адресу: Витебская область, г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, д. 1 (здание райисполкома, малый зал).

**Условия продажи пустующего дома:**

- при продаже пустующего дома права на соответствующий земельный участок не переходят;
- возмещение победителем аукциона расходов на организацию и проведение аукциона.

Заявки на участие в аукционе принимаются до 17.00 **23 марта 2010 г.** по адресу: Витебская область, г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, д. 1, кабинет 14, телефон 8 02151 5 21 94.

К заявлению об участии в аукционе прилагается документ, подтверждающий внесение задатка в размере 215 000 белорусских рублей на расчетный счет Верхнедвинского райисполкома № 3641313000222 в филиале 206 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Верхнедвинске, УНП 300063038.

Участие в аукционе оформляется подписанием соглашения, форма которого размещена на официальном сайте Верхнедвинского райисполкома в сети интернет.

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОРУССКИЕ ОБОИ» (ПРОДАВЕЦ), КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

### по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Обойная, 12, в составе зданий:

главного производственного корпуса, об. пл. 7107,8 кв.м; цеха глубокой печати (Фишер-Крекке-1), об. пл. 1781,4 кв.м; цеха глубокой печати (Фишер-Крекке-2), об. пл. 535,0 кв.м; склада готовой продукции (дизайн-центр, 2 этаж), 465,2 кв.м; склада готовой продукции № 2, 3008,7 кв.м; склада готовой продукции № 3 (магазин), 894,6 кв.м;а склада бумаги, 264,0 кв.м; склада бумаги № 2, 328,7 кв.м; склада, 255,5 кв.м; здания специализированного складов, хранилищ (склада спирта, компрессорная, зарядная), 219,8 кв.м; ремонтно-механической мастерской, 600,9 кв.м; слесарной мастерской РМЦ, 460,8 кв.м; котельной, 290,9 кв.м; здания локальных очистных сооружений, 405,4 кв.м; пожарного депо, 20,5 кв.м; здания производственно-служебных помещений, об. пл. 630,2 кв.м; инженерно-бытового корпуса, 4573,1 кв.м; здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автотранспорта (столярная мастерская, гараж), 256,4 кв.м; гаражей, 141,4 кв.м; 142,4 кв.м, а также *сооружений, инженерных сетей, благоустройства.* Начальная цена с НДС – 73 941 120 долларов США. Окончательный расчет в белорусских рублях производится по курсу Национального банка РБ на дату оплаты за объект. Площадь земельного участка **2,2117 га.** Задаток 250 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2009 г. Аукцион состоится **08.04.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 07.04.2010 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 18 марта 2010 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот |
|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Михановичский с/с, п. Михановичи |
| 2 | Кадастровый номер | 623684204601001287 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1397 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 600 670 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 35 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 3 400 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **18.03.2010 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 12.03.2010 г. в 17.00. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток за участие в аукционе перечисляются на расчетный счет Михановичского сельисполкома № 3604621090138 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600303747, код платежа 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (В этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет;
3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 6 апреля 2010 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода | Боровлянский с/с, д. Дроздово, У-35 | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино |
| 2 | Кадастровый номер | 623688006601000405 | 623688006601000406 | 623688006601000408 | 623688006601000409 | 623680602601000814 | 623685707101000160 | 623685707101000131 | 623685707101000141 | 623685707101000143 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1500 га | 0,1500 га | 0,1500 га | 0,1500 га | 0,1492 га | 0,1527 га | 0,1546 га | 0,1635 га | 0,1622 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 511 340 | 511 340 | 511 340 | 511 340 | 1 320 260 | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 70 000 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 100 000 000 | 100 000 000 | 100 000 000 | 100 000 000 | 90 529 068 | 15 000 000 | 15 187 000 | 16 060 000 | 15 933 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 9 900 000 | 9 900 000 | 9 900 000 | 9 900 000 | 9 000 000 | 1 400 000 | 1 500 000 | 1 600 000 | 1 500 000 |

| | | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 | Лот 17 | Лот 18 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Новашино | Петришковский с/с, д. Щеки | Петришковский с/с, д. Недреска | Лошанский с/с, д. Прудище | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 36 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 37 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 39 |
| 2 | Кадастровый номер | 623685707101000110 | 623685707101000161 | 623685707101000092 | 623685710101000003 | 623685706601000020 | 623684007601000061 | 623684001601000250 | 623684001601000251 | 623684001601000252 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1734 га | 0,1741 га | 0,1707 га | 0,2004 га | 0,1822 га | 0,2060 га | 0,2499 га | 0,2500 га | 0,2439 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 70 000 | 503 665 | 480 529 | 480 529 | 480 529 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 17 033 170 | 17 101 000 | 16 768 000 | 18 050 000 | 16 431 000 | 12 798 842 | 23 641 865 | 23 651 325 | 23 074 233 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 700 000 | 1 700 000 | 1 600 000 | 1 800 000 | 1 600 000 | 1 200 000 | 2 300 000 | 2 300 000 | 2 300 000 |

| | | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 | Лот 22 | Лот 23 | Лот 24 | Лот 25 | Лот 26 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 143 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 144 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 167 | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 4, квартал-1, ул. Баньковщина | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 5, квартал-1, ул. Баньковщина | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 19, квартал-1, ул. Баньковщина | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 20, квартал-1, ул. Баньковщина | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 33, квартал-1, ул. Баньковщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623686304601000541 | 623686304601000535 | 623686304601000537 | 623681708601002567 | 623681708601002568 | 623681708601002569 | 623681708601002570 | 623681708601002571 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1201 га | 0,1201 га | 0,1401 га | 0,1318 га | 0,1360 га | 0,1341 га | 0,1475 га | 0,1359 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 880 187 | 880 187 | 880 187 | 1 458 639 | 1 458 639 | 1 458 639 | 1 458 639 | 1 458 639 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 13 000 000 | 13 000 000 | 15 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 | 22 000 000 | 24 000 000 | 22 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 200 000 | 1 200 000 | 1 400 000 | 2 100 000 | 2 100 000 | 2 100 000 | 2 100 000 | 2 100 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **6.04.2010 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 31.03.2010 г. в 17.00. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе на Лоты 1–4 перечисляется на расчетный счет Щомыслицкого сельисполкома № 3600621180202 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лот 5 перечисляется на расчетный счет Боровлянского сельисполкома № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал АСБ «Беларусбанк», ул. Карбышева, 13/2, г. Минск, УНП 600052345, код платежа 04901.

На Лоты 6–14 – на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386.

На Лоты 15–18 – на расчетный счет Лошанского сельисполкома № 3600621060087, ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520 г. Минск, ул. Червякова, 2, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лоты 19–21 – на расчетный счет Самохваловичского сельисполкома № 3600621150173 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424 ОКПО 04430482, код платежа – 05520.

На Лоты 22–26 – на расчетный счет Ждановичского сельисполкома № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области (УНК 103), ф-л № 614 АСБ «Беларусбанк», код 520, УНП 600537220, назначение платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (В этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его кадастровой стоимости, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет;
3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Наталля ЗАЛОЗНАЯ:

# «ЗУСІМ НЯДАЎНА ЗРАЗУМЕЛА, ШТО МЯНЕ ВЕДАЮЦЬ»

## Мастакі, якія з'ехалі за мяжу, працягваюць лічыць сябе беларускімі творцамі

Ларыса ТІМОШЫК

**Іх не так мала — творцаў, якія жывуць у іншых краінах, але працягваюць любіць Беларусь. У іх па-рознаму склаўся творчы лёс: нехта штодня дбае пра тое, каб яго творчасць выжыла ў нязвыклых умовах, нехта здолеў упісацца ў новае асяроддзе і атрымаў поспех дзякуючы таленту. Талент — з'ява, якая існуе па-за любымі межамі, але заўсёды істотна, дзе была яго калыска ці гняздо, у якім упершыню расправіў крылы. І ведаеш, што можаш заўсёды вярнуцца сюды. І так здараецца, што нават тыя з нашых мастакоў, хто ўпісаўся ў еўрапейскі арт-працэс, імкнуцца, каб аднойчы іх гняздо не аказалася раскіданым.**

**Наталля Залозная — адна з самых вядомых і паспяховых беларускіх мастачак. Жыве ў Брусэлі, выстаўляецца актыўна ў розных краінах. Яе ведаюць там. І не паспелі забыць тут: яе першая за 10 гадоў персанальная выстава адкрылася ў Мінску. І калі толькі ўваходзіш у вялікую залу Музея сучаснага мастацтва, то па першым жа творы разумееш, што яго аўтарка бачыць у снах: браму Мінска, вечаровую, у агнях, нібыта ў тумане ці ў хісткіх згадках свядомасці... Але яна сама лепш пра гэта распавядзе.**

***— Цяпер вы выстаўляецеся ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Ініцыятыва музея ці ваша?***

— Мая ідэя. Мы з мужам вельмі даўно хацелі ў Мінску зрабіць выставу. Да нядаўняга часу адзіным месцам, дзе можна выставіцца, з'яўляўся Музей сучаснага мастацтва. Мы падалі заяўку, атрымалі станоўчы адказ. Абставіны спрыялі: у лістападзе ў мяне была выстава ў Маскве, адкуль я часткова прывезла працы ў Мінск. Некаторыя везла з Брусэля, яшчэ нейкія былі тут. Бо калі везці цалкам усю выставу, то будуць надта вялікія выдаткі і цяжкасці.

***— Калі мастак, які ўпісаўся ў заходні рынак, робіць выставу на радзіме і за свае грошы яе арганізоўвае, то, напэўна, ёсць сур'ёзныя матывы.***

— Матыў толькі адзін — заўсёды хочацца выстаўляцца на радзіме, каб цябе бачылі. Вельмі цікава адзнака творчасці, важна, як цябе прымаюць дома. Напэўна, многім будзе цікава, што я за гэты час удалечыні ад радзімы зразумела, як змянілася. На гэтай выставе паказваю ў асноўным працы за апошнія два гады. Некалькі твораў больш старых, з розных серый, напрыклад, з серыі «Іерусалімская бібліятэка», гэта тэкставыя шматслаёвыя кампазіцыі на шкле. Яшчэ нідзе не экспанаваліся, хоць прайшоў час, і я разумею, што гэтую тэхніку можна ўдасканаліць.



***— Дзе вашы творы ў Беларусі выстаўляліся да сённяшняга дня, як даўно гэта было?***

— У 1992 годзе ў нас была першая сумесная з Ігарам Цішыным выстава ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Потым удзельнічалі ў групавых выставах — зноўтакі ў мастацкім музеі, на тыя гады там працавала мастацтвазнаўца Вольга Каваленка, яна і прапанавала ўдзел у выставах.

***— Чаму прынялі рашэнне шукаць прыхільнікаў за мяжой? Ці лёгка было наважыцца, тым больш, што пераязджала ўся сям'я?***

— Вядома, намі кіраваў шэраг матываў. У першую чаргу непакоіла пэўная ізаляванасць мастацкіх працэсаў краіны ў еўрапейскім кантэксце, адсутнасць значных замежных выстаў у Беларусі, было жаданне ўбачыць нешта новае, назіраць за тым, што адбываецца ў сучасным мастацтве. І проста хацелася пагледзець свет, пашырыць свае гарызонты. Майстэрні ў Мінску, дзе мы маглі працаваць, не было, галерэй, з якімі мы маглі б супрацоўнічаць, таксама. Таму і вырашылі. Сям'я ў нас невялікая — я, муж і дзіця. Мацею было сем гадоў. У такім узросце дзеці лёгка адаптуюцца. Літаральна ў першы дзень ён упісаўся ў асяродак, нам, дарослым, не ведаючы мовы, было значна цяжэй, мы трапілі ў абсалютна іншыя ўмовы. Цяжкасцяў было шмат і страшна было.

***— Цяпер сталі там сваімі?***

— Наўрад ці гэта магчыма стаць цалкам сваім. Я там проста жыву і працую. Усё склалася ў мяне тут, у Беларусі, тут нарадзілася, выхоўвалася, бачыла і ўспрымала свет вакол сябе. Я заўсёды там буду замежнікам. Я зразумела, калі інтэнсіўна, шмат працаваць, тады атрымліваюцца добрыя працы, але для гэтага неабходны эсктрэмальны стан, які я цяпер там адчуваю. У Беларусі, мне здаецца, у мастакоў жыццё больш вольнае: тут дом, цёпла, утульна. За мяжой даводзіцца ў сто разоў больш інтэнсіўна працаваць.

***— Што вы маеце на ўвазе?***

— Часта здараецца так, што прамежак паміж выставамі вельмі кароткі, і часцей за ўсё неабходна рыхтаваць творы для кожнай выставы асобна. Напрыклад, калі мне галерэя прапануе выставу, яна будзе праз пару месяцаў — я рыхтуюся да яе, ствараю новыя працы. Яшчэ праз пару месяцаў у мяне ў іншай галерэі выстава... Яе хочацца зрабіць цэльнай, каб гэта не быў проста збор розных прац, а каб яны былі аб'яднаныя агульнай тэмай. Да таго ж галерэі бываюць вялікія і маленькія, гэта таксама розныя ўмовы. Часам думаеш і пра прастору. Галерэі часцей за ўсе адрозніваюцца адна ад другой сваім кірункам, і гэта таксама трэба ўлічваць.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# Больш бляску, МЕНШ ТУШЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Галоўнымі патрабаваннямі веснавога макіяжу будуць ненавязлівыя, лёгкія і свежыя пастэльныя адценні. Пра гэта паведаміла візажыст, суддзя міжнароднай катэгорыі па дэкаратыўнай касметыцы Таццяна Іванова.**

«Візажысты і дызайнеры ўсяго свету прапануюць выкарыстоўваць сёлетняй вясной толькі іскрыстыя і якія «свецяцца» пудры і танальныя пакрыцці. Для гэтага было дастаткова паглядзець модныя паказы — практычна кожная веснавая калекцыя вызначылася шымерамі, хайлайтэрамі і проста пудрамі з эфектам свячэння», — расказала яна.

Паводле слоў спецыяліста, у гэтым сезоне ніяк нельга прапусціць і карычневы колер ва ўсіх яго праявах. Хоць бы таму, што гэты колер падыдзе ўсім. Вясной 2010 года будуць актуальныя ўсе адценні карычневага, пачынаючы ад цёмнага шакаладу і заканчваючы светлым бэжавым.

Не перастае здзіўляць і шэры колер, які ўжо даўно заваяваў усе дызайнерскія калекцыі адзення, а цяпер вельмі грунтоўна прыйшоў у макіяж. «Не трэба думаць, што гэта нуднае і бляклае адценне, — упэўнена Таццяна Іванова. — У правільнай кампаніі шэры становіцца такім яркім і ясным! Напрыклад, спалучайце шэры з адценнямі фіялетавага або ліловага, тады ўбачыце, як ён «зайграе».

Тым, хто аддае перавагу больш яркім колерам, можна нават дадаць у свой макіяж крыху зелені, лічаць візажысты. Напрыклад, зялёны побач з ружовым або блакітным абавязкова спадабаецца аматаркам яркага макіяжу.

Як паведаміла Таццяна Іванова, у асаблівай пашане гэтай вясной будуць светлыя вусны — настолькі светлыя, што няхай яны нават зліваюцца і па тоне, і па колеры з тварам. І лепш, калі яны будуць матавымі. «Вясной 2010 года дызайнеры радуюць нас вялікай палітрай увільгатняльных лёгкіх бляскаў для вуснаў. Матавыя адценні і вусны, якія зліваюцца з колерам скуры твару, — модная фішка гэтай вясны», — адзначыла яна.

Сёлета ў асаблівай пашане ў модных дызайнераў і натуральны погляд. «Адсюль вынікае яшчэ адна тэндэнцыя: мінімальная колькасць тушы і падводкі. Вочы павінны быць чыстымі, адкрытымі і светлымі, як сама вясна», — лічыць візажыст. Таму дзяўчаты могуць спакойна цалкам адмовіцца ад тушы. А тым, хто ўсё ж незадаволены сваімі натуральнымі вейкамі, можна выкарыстоўваць умацавальную туш, часам падаўжальную, ну і вельмі рэдка — аб'ёмную».

**БЕЛТА.**

# У БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ СЛУЖАЦЬ КАЛЯ 4360 ЖАНЧЫН

**Прычым 389 з іх носяць афіцэрскія пагоны, каля 1140 з'яўляюцца прапаршчыкамі, 2830 праходзяць службу па кантракце на пасадах салдатаў і сяржантаў.**

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны, у званнях малодшых афіцэраў сёння служаць 300 жанчын. Колькасць старшых афіцэраў за апошнія 10 гадоў павялічылася амаль у 9 разоў — цяпер валодаюць пагонамі з двума прасветамі 90 жанчын, прычым 34 з іх — падпалкоўнікі. Сярэдні ўзрост жанчын-афіцэраў — 29 гадоў. Іх пераважная большасць служаць на пасадах ваеннага ўрача, псіхолага, перакладчыка, юрыста. Некаторыя ўзначальваюць аддзяленні ў ваенных камісарыятах.

**Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».**

## У гонар стваральніцы брэсцкай «Жырандолі»

У Брэсцкай абласной бібліятэцы прайшла прэзентацыя чарговага альманаха абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў краіны «Жырандоля». Літаратурны альманах славуты тым, што ля яго вытокаў у свой час стаяла слынная наша паэтэса Ніна Мацяш. І вось на імпрэзе было аб'яўлена, што неўзабаве выйдзе кніга ўспамінаў пра паэтку, якой ужо няма з намі. Створана рабочая група па падрыхтоўцы кнігі. Таксама прагучала прапанова штогод ладзіць рэспубліканскае свята паэзіі на радзіме Ніны ў Белаазёрску ў дзень яе народзінаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШАПЭН ЯК АДЧУВАННЕ

*Чым дарагі Беларусі польскі кампазітар-рамантык?*

**Той самай рамантыкай, якую мы ўсе чакаем, асабліва ўвесну. Таму натуральна, калі на адкрыцці фестывалю «Мінская вясна» галоўнай госцяй будзе яго музыка. І калі мы разважаем, як і дзе знайсці рамантыку ў жыцці — варта ўсяго толькі схадзіць на канцэрты ў «Белдзяржфілармонію», каб музыка напоўніла думкі верай у боскі пачатак усяго свету, які павінен прыйсці да гармоніі. 7 сакавіка ў Вялікай зале прагучыць першы фартэпіянны канцэрт Фрэдэрыка Шапэна ў выкананні расійскай піяністкі Юліяны Аўдзеевай разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава. Вось дзе было б найлепшае свята — хто б запрасіў...**

Аднак «Мінская вясна» задумвалася так, каб нават не паспеўшы на адзін канцэрт, вы ўсё роўна не размінуліся з Шапэнам. Бо яму сёлета — 200 гадоў і гэта тая дата, якую ў нашай краіне будуць адзначаць шырока. Так, польскі геній ніколі не быў на тэрыторыі Беларусі. Аднак «партытура яго жыцця» ўтрымлівае ліцвінскую тэму — у гэтым упэўненыя ўдзельнікі ансамбля «Класік-авангард». Каб зразумець, што яны маюць на ўвазе, трэба пайсці на канцэрт 10 сакавіка ў Малую залу філармоніі. Музыкі адшукалі «беларускі след» у творчасці кампазітара — у мелодыі ліцвінскай песні. Аднак нам абяцаюць калі не сенсацыю, то дакладна адкрыццё. І адным такім адкрыццём мы не абмяжуемся.

Бо акрамя веснавога музычнага фестывалю будуць і іншыя канцэрты з рамантычнай музыкай польскага кампазітара — год Шапэна ў Беларусі!

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ДЭБЮТ У ТРЭЦІМ ПАКАЛЕННІ

Ярка, прыгожа і ўпэўнена заявіла пра сябе маладая мастачка Аня Гоманава, першая аўтарская выстава якой адкрылася ў сталічнай галерэі «Ла Сандра-арт» па вуліцы Раманаўская Слабада. А яшчэ зусім нядаўна Аня ззяла на сцэне ў складзе папулярнага беларускага гурта «Топлес».

Яе працаздольнасці могуць пазайздросціць і больш моцныя, спрактыкаваныя мужчыны-мастакі. Крышку больш, чым за паўгода Аня стварыла 26 жывапісных палотнаў, якія і былі прадстаўлены ў экспазіцыі выставы.

...Успамінаю такі ж зімовы надвячорак гадоў дванаццаць—трынаццаць таму. Нясвіж. Гістарычны музей. Светлая, цёплая, утульная зала. Шматлюдна. Урачыстае адкрыццё выставы дынастыі беларускіх мастакоў Гоманавых. Старэйшы — слынна вядомы Уладзімір Кірылавіч, які ўвайшоў у гісторыю беларускага мастацтва жывапіснымі пейзажамі родных краявідаў, партрэтамі, нацюрмортамі, сюжэтнымі палотнамі; яго сын Леанід, ужо тады ўпэўнена заняўшы сваю нішу пейзажыста-лірыка, і ўнучка Анечка. Было ёй на той час гадоў 11-12. Зразумела ж, яе працы на фоне дзядулі ды бацькі выглядалі мо не так па-майстэрску выкананыя, але шчырасць і непасрэднасць ужо тады адчуваліся.

З таго часу пройдзены прыступкі жыццёвай практыкі, набыцця адукацыі, у тым ліку і мастацкай, праца ў шоу-бізнэсе... І вось дэбютная персанальная выстава. Яна атрымалася яркай, эмацыйна насычанай, узнёслай.

Як сказала падчас адкрыцця мастацтвазнаўца Ларыса Бортнік, у Ані няпростая задача: знайсці менавіта свой шлях у мастацтве. Здаецца ў яе гэта атрымалася. Напрацоўкі дзеда і бацькі яна бярэ як аснову, а далей цалкам дае волю эмоцыям і інтуіцыі. З нявыказнай смеласцю мастачка пераўтварае рэальныя рэчы ў мудрагелістыя каларыстычныя кампазіцыі. Прысутнічаюць тут і экспрэсія, і яркая дэкаратыўнасць, і мяккія, лірычна стрыманыя матывы.

Дэбют адбыўся. Упэўнена, што наперадзе ў Ані яшчэ шмат выстаў і прэзентацый.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.**





## Усміхнемся!

Калі не ведаеце, што падарыць жонцы на 8 сакавіка — разбярыце, нарэшце, ёлку!

☺

**Маленькі хлопчык пытае ў таты:**

**— Тата, а чаму дзень 8 сакавіка вылучаны ў календары чырвоным колерам?**

**— Гэта, сынок, колер нашай з табой мужчынскай крыві!**

☺

8 сакавіка. Ім, жанчынам, салодкі чай з торцікам і шакаладкай, а нам, мужыкам, ізноў піць гэтую горкую нясмачную гарэлку...

☺

**Мужчынскае, набалелае.**

**Чаму цэны на пену для галення і трусы да 23 лютага не змяняюцца, а вось кветкі да 8 сакавіка даражэюць у два разы?!**

☺

8 сакавіка, за сталом .

— Дарагая, сёння толькі тваё свята! Сёння мы сабраліся тут толькі з-за цябе! Сёння мы п'ём толькі за цябе! І калі што-небудзь здарыцца, вінаватая будзеш толькі ты!

☺

**Ідэальная жонка — гэта жанчына, якая нарадзілася 8 сакавіка і з якой вы пазнаёміліся і ажаніліся 8 сакавіка. І гэта не толькі эканомія на падарунках! Хай толькі паспрабуе калі-небудзь спытаць: «Мілы, а ты не забыўся, які сёння дзень?»**









***СА СВЯТАМ ВАС, МІЛЫЯ ЖАНЧЫНЫ! :-)***

# Цяпер у модзе сціплыя букеты кветак у натуральным стылі афармлення

Сёння ў моду ўваходзіць еўрадызайн у афармленні букетаў — усё павінна быць сціпла, натуральна, ніякай вычварнасці, бліскавак і стужак. У модзе палявыя кветкі ў мінімалістычным афармленні — сціплыя букеты, перавязаныя дэкаратыўным шнурам або жгутом, і ніякіх цэлафанавых упаковак, гафрыраванай паперы. Пра гэта напярэдадні 8 Сакавіка расказала БЕЛТА вядучы фларыст салона «ТЭРРА», фларыст міжнароднага класа, выпускніца міжнароднай школы фларыстыкі «Ніколь» Наталля Івашкевіч.

Паводле слоў спецыяліста, на змену хрусткай упакоўцы прыйшлі тканінны матэрыял кшталту льнянога грубага палатна або мяккая каляровая папера. Асабліва модная так званая фларыстычная ўпакоўка букетаў, калі сцяблінь кветак упрыгожваюцца не штучным матэрыялам, а буйным лісцем зеляніны.

«Калі вы дорыце кветкі маладой дзяўчыне, то букет павінен быць лёгкі, амаль празрысты, аформлены натуральнай тканінай або жгутом, — дае парады Наталля Івашкевіч. — Для пажылой дамы будзе дарэчы больш шчыльны букет у традыцыйным афармленні. А для жанчыны-кіраўніка ў складзе букета павінна быць не больш за тры віды каляровай гамы. Букет абавязкова павінен мець або круглую форму (гэта сімвал кар'еры чалавека, якая здзейснілася), або быць высокім, таму што вертыкальны стыль падкрэслівае імкненне чалавека дасягнуць больш значных вышыняў».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Колер бутонаў стылісты выбіраюць у залежнасці ад колеру вачэй і валасоў жанчын. Так, кветкі для бландзінак не павінны быць вельмі яркімі, ім падыходзяць ружы, хрызантэмы, калы, лілеі або архідэі пяшчотных адценняў, напрыклад, ружовыя, белыя або светла-жоўтыя. Хоць стылісты сцвярджаюць, што адна ярка-аранжавая ружа можа таксама выдатна глядзецца ў руках дзяўчыны са светларусымі валасамі. Для брунетак добрым варыянтам могуць быць яркія колеры чырвоных адценняў: ружы, вяргіні, насычаныя гваздзікі або гладыёлусы, а таксама архідэі. Для вогненна-рыжых асобаў можна выбраць фіялетавыя і цёмна-сінія колеры, такія як гіяцынты, фіялкі, незабудкі.

Самыя ўрачыстыя кветкі — белыя, яны сімвалізуюць чысціню, падыходзяць для маладых дзяўчат, нявест. Дамам элегантнага ўзросту іх не варта дарыць. Бэзавы, фіялетавы і сіні — адны з самых элегантных. Такія кветкі гавораць пра тое, што іх атрымальнік — асоба вытанчаная.

Наталля Івашкевіч выказала таксама некалькі заўваг наконт дарэчнасці дарэння гваздзікоў і жоўтых кветак на 8 Сакавіка. На думку спецыяліста, традыцыйныя чырвоныя буйныя гваздзікі звычайна жанчынам не дораць, таму што прынята лічыць, што гваздзікі — строгая афіцыйная кветка. Гэта кветка — відавочна не прымета жаноцкасці. А вось з меркаваннем пра тое, што жоўтыя цюльпаны — вестуны разлукі, фларыст не пагадзілася. «Гэта ўсё бабуліны казкі. Жоўты колер азначае сонечны, цёплы, ён надае добрую энергетыку тым, хто іх дорыць, і тым, каму ўручаюць, таму смела можаце дарыць і жоўтыя цюльпаны, і чайныя ружы», — падкрэсліла яна. Дарэчы, папулярны букет з галінак мімозы таксама — жоўты.

Што датычыцца рэкамендацый, як працягнуць жыццё букету, то ў Наталлі Івашкевіч парады вельмі простыя: трэба абавязкова падрэзаць сцяблінь, абарваць лісце, якое знаходзіцца ў вадзе, і кожны дзень мяняць ваду. Кветкі ставяцца ў адносна прахалоднае месца. Галоўнае — пазбягаць блізкасці батарэй і іншых ацяпляльных і асвятляльных прыбораў, інакш кветкі хутка раскрыюцца і пачнуць падсыхаць. Асабліва гэта датычыцца цюльпанаў, якія, дарэчы, аддаюць перавагу вадзе з кубікамі лёду. Архідэі баяцца скразняку. А гербера любіць цёплую ваду. Кончыкі сцяблін ружаў трэба абавязкова падрэзаць пад вадой, каб абмежаваць доступ кіслароду ў сцябліны. А каб не памыліцца з набыццём кветак, заўсёды звяртайце ўвагу на сцябліны расліны — яны павінны быць свежыя, а пялёсткі — з акуратнымі кончыкамі.

Да ведама

## ДАІ ў гэтыя выхадныя будзе асабліва строга ставіцца да п'яных вадзіцеляў

**У гэтыя выхадныя дні Дзяржаўтаінспекцыя будзе асабліва строга ставіцца да п'яных вадзіцеляў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва УДАІ МУС Беларусі.**

Ужо з сённяшняга дня ДАІ ўзмацняе кантроль на аўтатрасах. У гэтыя выхадныя і напярэдадні, як заўсёды, чакаецца павелічэнне патоку аўтамабіляў. Таму спецпадраздзяленне УДАІ МУС «Страла» практычна ў поўным складзе выязджае ў камандзіроўкі ў розныя рэгіёны Беларусі.

Інспектары «Стралы» бяруць пад кантроль найбольш важныя ўчасткі аўтатрас. Гэтымі днямі яны з асаблівай увагай будуць сачыць за парадкам на дарогах. За кіраванне машынай у нецвярозым стане супрацоўнікі ДАІ будуць накладаць максімальныя штрафы. Тое ж самае датычыцца тых выпадкаў, калі аўтамабілем кіруюць людзі, якія не маюць вадзіцельскага пасведчання. Прыцягнуць да строгай адказнасці і вадзіцеляў, якія выязджаюць на сустрэчную паласу з парушэннем ПДР.

ДАІ раіць таксама пешаходам быць вельмі ўважлівымі і не перабягаць трасы ў неналежных месцах. Веласіпедыстам і вадзіцелям мапедаў трэба помніць, што пры галалёдзіцы або снегападзе ім забараняецца рухацца па праезнай частцы. У Дзяржаўтаінспекцыі спадзяюцца, што ўсе ўдзельнікі руху не станучь парушаць ПДР, каб не азмрочваць сабе і іншым выхадныя дні.

# «КАЛІ Б КОЖНЫ ЎСЯГО ПА ТРЫ ТЫСЯЧЫ НА ГОД...»

**Некалі ўсю Беларусь абляцела навіна: «Адна з беларускіх медыцынскіх сястрычак атрымала самую высокую адзнаку прафесійнай дзейнасці ад Міжнароднай арганізацыі Чырвонага Крыжа». Што за ўзнагарода такая, яшчэ мала хто ведаў, але ж адразу ва ўсіх узбудзілася сапраўдная цікавасць: і не дарэмна, бо сярод беларусак найрэдкую прэмію «Флорэнс Найтынгейл», якую прысуджаюць за найвялікшы ўклад у дабрачыннасць, атрымалі толькі 6 медыцынскіх работнікаў, дый тое падчас Вялікай Айчыннай. А атрымаць у мірны час такую ўзнагароду — сапраўды, не частая з'ява...**



Ніна Мікалаеўна распавяла, што «Звязда» — сямейная газета.

Ніну Мікалаеўну БЛІЗНЮК напаткалі мы ў Фрунзенскім раённым аддзеле Беларускай арганізацыі Чырвонага Крыжа. Наша гераіня настолькі сціплы чалавек, што мне на нейкі момант стала ніякавата...

— Дзяцінства маё было цяжкае — самі разумееце, вайна — а пасля, бадай, яшчэ больш цяжкі пасляваенны перыяд. У 13 гадоў я ўжо працавала ў калгасе, вядома, за бясплатна — у той час ніхто за працу не плаціў, — распавядае Ніна Мікалаеўна. — А пасля захварэлі мае бацькі... Як бацькоў не стала, паехала я ў Мінск, але ж і там усе, як бачыла, хварэюць. Паколькі мяне гэтыя хваробы ўвесь час суправаджаюць, дык я і вырашыла прысвяціць сябе людзям... Вось і пачаўся мой шлях: спачатку працавала ў яслях-садку, а потым скончыла курсы медсястрычак і атрымала накіраванне ад «Чырвонага Крыжа» ў 20 паліклініку.

Такім чынам пачынаючы з 1967 года і па сёння Ніна Мікалаеўна прысвяціла сваё жыццё службе людзям. А даглядаць даводзілася, у асноўным, самых цяжкіх хворых. Чаму так? Магчыма таму, што на «Чырвоны Крыж» заўжды выпадала такая праца. Вось, і атрымлівалася, што ўчастковыя сястрычкі назіралі толькі за здароўем, а ўвесь асноўны цяжар, які самі адзінокія старыя і інваліды зрабіць, у літаральным сэнсе, не маглі, лёг на плечы сястрычак, такіх, як Ніна Мікалаеўна.

— Чаму ж менавіта мне выдадзена гэта прэмія «Флорэнс Найтынгейл»?.. Я думаю, гэта не толькі мая заслуга, а, падаецца, гэта заслуга ўсіх... У нас у раёне Вера Міхайлаўна адпрацавала, здаецца, 25 гадоў, Ларыса Іванаўна — 30 гадоў, а мая напарніца ўвогуле амаль як я — 42 гады. Мы заўжды і ўсё робім разам: калі ў каго-небудзь штосьці не атрымліваецца, мы ўсе дапамагаем у працы... Ну, разумееце, трэба ж было камусьці даць гэтую ўзнагароду — так выйшла, што выбар прыпаў на маё імя.



Так выглядае ўзнагарода «Флорэнс Найтынгейл».

Магчыма, недзе з-за сваёй сціпласці Ніна Мікалаеўна і прымяншае ўласны ўнёсак у агульную справу, але кавалачак праўды тут ёсць, бо, можа, сапраўды гэта дасягненне і ацэнка дзейнасці ўсіх членаў «Чырвонага Крыжа» Беларусі?! Можа і таму, што ўжо некалькі дзясяткаў гадоў гэтая арганізацыя трымаецца выключна на ахвяраванні.

— Я так лічу, калі б кожны грамадзянін краіны ахвяраваў хоць бы па 3 тысячы на год, дык мы б змаглі дапамагаць усім, каму гэта патрэбна. Разумееце, раней нас было 50 сястрычак на Мінск — і гэта было больш-менш, — а цяпер толькі 13...

І раптам у кабінеце зазваніў тэлефон:

— Што з табой? Чаго ты не падымаў цэлы дзень? — запытала праз трубку Ніна Мікалаеўна. — Паміраеш? Што, ніхто не прыходзіў да цябе? Альбо ты не адчыніў? А калі я прыйду, зможаш паўзком адчыніць мне?..

Ніна Мікалаеўна сустракаецца з гэтым кожны дзень, прычым, робячы гэта на, лічыце, добраахвотнай аснове, калі зарплату за такую цяжкую, самаадданую і важную працу, медсястрычкі атрымліваюць толькі 300 тысяч рублёў, а гэта крыху больш за пражытковы мінімум... Сумна! Але ж, напэўна, за такую вось гераічную працу Ніна Мікалаеўна Блізнюк і атрымала прэстыжную міжнародную прэмію «Флорэнс Найтынгейл». Кожнаму з нас варта памятаць пра гэта і зрабіць свой, хоць і маленькі, унёсак у вялікую справу!

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**
**Аляксандра ЧАРНЮК.**

## ЗРОБІМ ДАБРАЧЫННАСЦЬ РАЗАМ:

*Арганізацыя Чырвонага Крыжа існуе толькі за кошт добраахвотных ахвяраванняў ад неабыякавых грамадзян. Кожны можа ахвяраваць грошы ў падтрымку гэтай арганізацыі. Для гэтага дастаткова пералічыць адпаведную суму на разліковы рахунак: «Мінская гарадская арганізацыя Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа, г. Мінск, вул. Першамайская, 20, корп. 3, р/р 3015212620014, код 764, УНП 100511893».*

*«Калі б кожны грамадзянін краіны ахвяраваў хоць бы па 3 тысячы на год, дык мы б змаглі дапамагаць усім, каму гэта патрэбна...»*

Іван КАРЭНДА

# СВЕТЛЫХ ЗГАДАК БУКЕТ...

З цыкла «Зямныя зоркі»

**У Гародні**

*Вязі мяне, вячэрняе таксі,*
*Па вуліцах студэнцкай маладосці,*
*Дзе столькі віравала весялосці,*
*На ўсё хапала выдумкі і сіл.*

*Вязі мяне, хутчэй вязі, таксіст,*
*Туды, дзе спеліў інстытут надзеі,*
*Дзе лепшым,*
*найвялікшым дабрадзеем*
*Быў наш дэкан —*
*галоўны фінансіст.*

*Вязі мяне, маршрутнае таксі,*
*Па вуліцах шчаслівага юнацтва,*
*Дзе грэх было вясной*
*не закахацца*
*І на руках каханай не насіць.*

*Вязі мяне, таксі, вязі туды,*
*Дзе лета пахне*
*першым пацалункам —*
*Святой Каложы*
*боскім падарункам*
*На ўсе мае пазнейшыя гады.*

*Вязі мяне, вячэрняе таксі.*
*Гародня родным горадам*
*мне стала.*
*А я, няўдзячны, заплаціў ёй мала...*
*...Прыехаў прабачэння папрасіць.*

* * *

**Н.В.**

*Восень жоўтай хусцінкай*
*За акном прамільгне,*
*Успамін-павуцінку*
*Ціха дорачы мне.*

*Падарунак прыму я,*
*І аддзячу як след:*
*Запішу-зарыфмую*
*Светлых згадак букет.*

*Зноў убачу я горы*
*І лістоту ў агні,*
*Пяцігорскія зоры*
*І дажджлівыя дні.*

*І курортную сцежку,*
*Дзіўны позірк вачэй,*
*Як маланку — усмешку,*
*Што за сонца ярчэй.*

*Вераснёўскі апоўдзень*
*У вачах праплыве,*
*І сустрэчная споведзь,*
*Да драбніц, ажыве.*

*Я вярнуся ў той вечар,*
*Нібы ў казачным сне...*
*Хоць даўно збег у вечнасць,*
*Не забыць яго мне.*

*Двое ў ціхім пакоі.*
*Дождж па шыбах бубніць.*
*А пачуцці — ракою,*
*Не стрымаць, не спыніць.*

*Трапяткое дыханне...*
*Нечаканы працяг...*
*Нараджэнне кахання —*
*Таямніца жыцця...*

*...Успаміны — не рэчы,*
*Не адсунеш убок,*
*Не спрабуй — не адпрэчыш*
*Здумак-згадак клубок.*

*...Не згубілася ў часе,*
*Саграваe душу*
*Тая песня пра шчасце,*
*Што прыдумаў Машук...*

*Долі я не пярэчыў...*
*Час стагуе тугу...*
*Восень нашай сустрэчы*
*Я забыць не магу.*

* * *

*Усё пайшло праз берагі,*
*Кіпяць успененыя хвалі.*
*Каханне мы не зберaглі,*
*Каханне мы не ўратавалі...*

*На рамантычным караблі*
*Пад белым ветразем надзеі*
*Па моры шчасця мы плылі,*
*Удалячынь з табой глядзелі.*

*Як здані, хмары наплылі,*
*Прынёсшы шторм і хваляванне...*
*...І толькі бурбалкі пайшлі*
*Ад нашых мар і спадзяванняў.*

*Не падказала доля нам*
*Патрэбных слоў выратавальных...*
*Незразумелая віна*
*Гучыць акордам развітальным.*

**НЕ ЖУРЫСЯ...**

**З народнага**

*Не журыся, не журыся,*
*Сінявокая Марыся...*

*Сонца сядзе за пагоркам —*
*Выйдзі з хаты на вячоркі.*

*Дзе збіраюцца дзяўчаты,*
*Дзе гуляюць хлопцы-хваты.*

*Там і песні, і пацешкі,*
*Гульні, прымаўкі, пасмешкі.*

*А знарок запыніць жартам*
*Хлопец спрытны, зухаваты, —*

*Гэта сцежачка прамая —*
*На цябе ён вока мае.*

*Зразумееш і без слоў —*
*Правядзе цябе дамоў.*

*Не спяшайся, прыглядзіся.*
*З ім па вуліцы прайдзіся.*

*Падвядзе да самай брамкі,*
*Прастаіць з табой да ранку.*

*Усміхнецца — усміхніся,*
*А прыгорне — прыгарніся...*

*Прашапчы яму: «Кахаю...*
*І другога не шукаю...»*

*А як ён мацней прыцісне —*
*У гаі салоўка свісне...*

*Значыць, хлопец, сэрцу любы,*
*Павядзе цябе да шлюбу.*

*Уцякай хутчэй у хату...*
*З дня на дзень чакай у сваты...*

*...Не журыся, не журыся,*
*Сінявокая Марыся.*

* * *

*Я не ўбачу цябе, не ўбачу...*
*Ну за што не ўзлюбіў так лёс?*
*Разрываецца сэрца, плача,*
*Захлынаецца ў моры слёз.*

*Я не ўбачу цябе, не ўбачу...*
*Праклінаць буду чорны дзень,*
*Што жыццё маё перайначыў,*
*Патушыў у душы спадзеў.*

*Я не ўбачу цябе, не ўбачу...*
*І чакаю сустрэч дарма.*
*Ростань жарам пячэ гарачым,*
*Хоць віны тут маёй няма.*

*Я не ўбачу цябе, не ўбачу...*
*Пад нагамі ходзіць зямля.*
*У сумётах бяды-няўдачы*
*Студзіць шчасце маё зіма.*

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 06 апреля 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание специализированное иного назначения (склад тары), инв. номер 110/С-87271, площадь – 521,9 кв. м;<br>- насаждения производственных площадей. | - здание специализированное иного назначения (здание административно-хозяйственное с пристройкой – 8 кв. м, дворовым покрытием – 3200 кв.м, забором, воротами, калиткой), инв. номер 640/С-26358, площадь – 91,0 кв. м;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад с котельной с пристройкой), инв. номер 640/С-26363, площадь – 831,0 кв. м;<br>- здание специализированное иного назначения (цех ремонта возвратной тары со складом и навесом), инв. номер 640/С-26356, площадь – 233 кв. м;<br>- здание специализированное иного назначения (цех новой тары с механической мастерской и пристройкой), инв. номер 640/С-26361, площадь – 708,0 кв. м;<br>- сооружение специализированное энергетики (кабельная линия электропередач), инв. номер 640/С-50116;<br>- сооружение специализированное коммунального хозяйства (водопровод), инв. номер 640/С-50117;<br>- зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 070/09. | - здание специализированное иного назначения (здание арочного типа), инв. номер 610/С-29306, площадь – 433,0 кв.м;<br>- здание специализированное иного назначения (производственный корпус с навесом и холодной пристройкой), инв. номер 610/С-29302, площадь – 247,9 кв. м;<br>- здание специализированное иного назначения (здание арочного типа), инв. номер 610/С-29297, площадь – 426,0 кв.м;<br>- здание специализированное иного назначения (помещение охраны с пристройкой, крыльцом, дорогой, площадкой, забором), инв. номер 610/С-29321, площадь – 66,0 кв.м;<br>- здание административно-хозяйственное (административно-бытовой корпус с холодной пристройкой), инв. номер 610/С-29308, площадь – 231,0 кв. м;<br>- сооружение специализированное энергетики (линия электроснабжения), инв. номер 610/С-48383;<br>- зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 071/09. | - здание конторы (с холодной пристройкой), инв. номер 622/С-20476, площадь 52,1 кв. м;<br>- здание слесарной мастерской, инв. номер 622/С-20473, площадь – 38,4 кв. м;<br>- здание цеха ширпотреба, инв. номер 622/С-20474, площадь – 345,6 кв. м;<br>- здание цеха ширпотреба, инв. номер 622/С-20475, площадь – 71,7 кв. м;<br>- здание специализированное энергетики, инв. номер 622/С-33647, площадь – 37,4 кв. м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 077/09. |
| **Местонахождение имущества** | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный, 2-й, д. 25 | Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, пер. Пролетарский, 2-й, д. 12 | Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Заводская, 31 | Минская область, Столбцовский район, Новосверженский с/с, д. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 12 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь земельного участка 0,1765 га, кадастровый номер 141000000007003168; | площадь – 1,0180 га, кадастровый номер 624650100001005929, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 1,8144 га, кадастровый номер 640400000012000062, назначение – обслуживание и эксплуатация зданий и сооружений производственной базы | площадь – 1,9276 га, кадастровый номер 625484503101000700, назначение – эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 171 912 000 белорусских рублей | 529 541 880 белорусских рублей | 385 560 000 белорусских рублей | 139 356 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 17 000 000 белорусских рублей | 52 000 000 белорусских рублей | 38 000 000 белорусских рублей | 13 000 000 белорусских рублей |
| **Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия)** | 1/06 от 19.09.2009 г. (по 18.09.2012 г.) склад тары-223,2; 3,7 % | | № 21 от 07.08.2009 (по 06.08.2012) здание арочного типа – 213,0 кв. м; 10,4 % | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **06 апреля 2010 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 09.03.2010 по 02.04.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 294 67 13, (8029) 636 15 22 – ОАО «Белпромтара».**
**Интернет: www.mgcn.by**

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 06 апреля 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание конторы, инв. номер 630/С-42877, площадь – 278,8 кв.м;<br>- здание котельной с сушилкой, инв. номер 630/С-42872, площадь – 170,0 кв.м;<br>- здание цеха новой тары, инв. номер 630/С-42874, площадь – 476,4 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42875, площадь – 993,0 кв.м;<br>- здание гаража, инв. номер 630/С-42876, площадь – 318,9 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42879, площадь – 655,9 кв.м;<br>- здание лесопильного цеха, инв. номер 630/С-42855, площадь – 481,7 кв.м;<br>- здание производственного цеха тары, инв. номер 630/С-42869, площадь – 597,7 кв.м;<br>- асфальтовое покрытие, инв. номер 630/С-50723, площадь – 6199,8 кв.м;<br>- водоем пожарный, инв. номер 630/С-50720; объем – 158.4 куб. м, диаметр – 7,0 м, глубина – 3,6 м;<br>- участок водопроводной сети, инв. номер 630/С-50721, протяженность – 159,5 м;<br>- линия электропередач, инв. номер 630/С-50726, протяженность – 656 м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 051/09 | - Административное здание (в том числе: уборная, ограждение, ворота металлические, ворота металлические, забор деревянный, колодец ж/б), инв. номер 443/С-1626, площадь 82,0 кв. м;<br>- склад тары № 1, инв. номер 443/С-1627, площадь – 99,6 кв. м;<br>- склад тары №2, инв. номер 443/С-1628, площадь 98,6 кв.м;<br>- склад прочей тары, инв. номер 443/С-1629, площадь – 973,4 кв.м;<br>- навес для хранения тары, инв. номер 443/С-1630, площадь – 412,6 кв.м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 052/09. | - Здание конторы (в том числе: беседка, беседка, уборная, забор, ворота, калитка), инв. номер 450/С-5923, площадь 54,1 кв. м;<br>- производственный цех, инв. номер 450/С-5926, площадь – 1220,9 кв.м;<br>- асфальтобетонное покрытие, инв. номер 450/С-20691, площадь – 1091,1 кв.м;<br>- канализационный выпуск, инв. номер 450/С-20693;<br>- водопроводный ввод, инв. номер 450/С-20694;<br>- сеть электроснабжения, инв. номер 450/С-20695,<br>- зеленые насаждения. |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 54 | Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 7 | Гродненская область, г. Слоним, ул. Железнодорожная, д. 3 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 2,6213 га, кадастровый номер 642000000003001231; площадь – 0,1816 га, кадастровый номер 642000000003001230, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 0,9336 га, кадастровый номер 425650100001000935, назначение – размещение производственной базы | площадь – 0,5614 га, кадастровый номер 425450100001001503, назначение – обслуживание зданий и сооружений |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 875 038 800 белорусских рублей | 217 383 600 белорусских рублей | 220 362 120 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 85 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей |
| **Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия)** | | | Договор № 40 от 12.02.2010 г. по 11.02.2013 г. (произ.цех-58,8 м²) |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

